## *ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА*

*УДК 821.161.3.09-1*

*Т. А. АЛЯШКЕВІЧ*

# СІНЕРГЕТЫКА ПАЭТЫЧНАГА ТВОРА

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 15.10.2013)*

Развіццё любой навукі, у тым ліку і літаратуразнаўчай, пастаянна вядзе да з'яўлення новых ведаў. Акрамя таго, працэс міждысцыплінарнай інтэграцыі, які «паглынуў» навуку XX–XXI стагоддзяў, прыводзіць да распаўсюджвання навуковай інфармацыі ў самыя розныя галіны навукі, нават абсалютна няроднасныя. У дадзеным артыкуле робіцца спроба прадэманстраваць, як веды са сферы сінергетыкі трансфармуюцца да сферы паэтыкі, дакладней, да фонасемантыкі паэтычнага твора. Для гэтага мэтазгодна, па-першае, выявіць асноўныя ўнутраныя кропкі судакранання паняційнага апарату сінергетычнай навукі з сістэмай паэтычнага твора, а, па-другое, вызначыць, як за кошт фонасемантычнага складніка паэтычны твор набывае статус складанай сінергетычнай сістэмы.

Сінергетыка – навука, прадметам увагі якой выступаюць складаныя сістэмы самага рознага парадку. У навуковых колах існавала мноства спрэчных пытанняў адносна сінергетыкі: лічыць яе асобнай навуковай дысцыплінай альбо міждысцыплінарнай парадыгмай. На карысць міждысцыплінарнага статусу сінергетыкі сведчыць хаця б тое, што яна дазваляе даследаваць прынцыпова розныя класы аб'ектаў, што вывучаюцца рознымі навуковымі дысцыплінамі самастойна. Акрамя таго, сінергетыка аперыруе даволі ўніверсальным катэгарыяльным апаратам. У энцыклапедычным слоўніку даецца наступнае азначэнне сінергетыкі: «Сінергетыка – міждысцыплінарны кірунак, які даследуе складаныя сістэмы, што складаюцца з многіх падсістэм рознай прыроды» [2, с. 967]. Прапанаваны Г. Хакенам тэрмін сінергетыка акцэнтуе ўвагу на ўзгодненасці ўзаемадзеяння частак пры ўтварэнні структуры як адзінага цэлага [9]. Улічыўшы гэта, можна дапусціць, што сінергетычная парадыгма можа быць ужыта і прыстасавана да сістэмы гуманітарных навук, у нашым выпадку – да літаратуразнаўчай, а больш дакладней, да вывучэння паэтыкі мастацкага твора. Аднак перад тым, як падысці да разгляду асноўных паняццяў сінергетыкі і іх праяўлення ў межах паэтычнай сістэмы мастацкага твора, засяродзім увагу на самім прадмеце сінергетыкі.

Як было згадана вышэй, сінергетыка вывучае **складаныя сістэмы**. І складанасць такой сістэмы пры гэтым разумеецца, галоўным чынам, не толькі як наяўнасць у сістэме вялікай колькасці частак, элементаў альбо кампанентаў, якія могуць звязвацца паміж сабой больш ці менш складаным чынам (Хакен лічыць такі падыход да разумення тэрміна «складанай сістэмы» наіўным, хоць і не адмаўляе яго: «Розныя галіны навукі даюць нам шматлікія прыклады сістэм, што называюцца складанымі. Адны з іх аказваюцца даволі простымі, у той час як іншыя аказваюцца сапраўды складанымі» [9, с. 18]), але як наяўнасць іманентнага патэнцыялу самаарганізацыі. Паказчык складанасці сінергетычнай сістэмы, адзначае М. А. Мажэйка, выключна дынамічны, пры гэтым ставячы знак роўнасці паміж тэрмінамі «складаная сістэма», «дынамічная сістэма», «сістэма, здольная да самаразвіцця» [5, с. 8].

Разгледзім асноўныя паняцці сінергетыкі і паспрабуем вызначыць, як сінергетычны паняційны апарат знаходзіць сваё ўвасабленне ў мастацкім творы і яго паэтыцы.

Да асноўных паняццяў сінергетыкі адносяцца наступныя. Першае цэнтральнае паняцце – *складаная нелінейная сістэма*, якая можа знаходзіцца ў стане ўстойлівасці і няўстойлівасці, а таксама можа падвергнуцца «дэзінгрэсіі» [8, с. 9], інакш кажучы, поўнай дэфармацыі альбо разбурэнню. У нашым выпадку, з аднаго боку, непасрэдна сам паэтычны твор і ёсць складаная, нелінейная, шматузроўневая функцыянальна-эстэтычная сістэма, якая «...уяўляе сабой не лінейны ланцужок слоў, што выражаюць адзіны, як бы тэлеалагічны сэнс («паведамленне» Аўтара-Бога), але шматмерную прастору» [1, с. 388]. Паэтычны тэкст фарміруе ў аўтарскай свядомасці і свядомасці чытацкай складаную неадназначную карціну свету, што надае паэтычнаму тэксту своеасаблівы статус мастацкага тэксту. Усе кампаненты такой сістэмы эстэтычна арганізаваны, маюць мастацкі сэнс, падпарадкоўваюцца мастацкаму заданню. У такой сістэме кожны з узроўняў выступае асобнай часткай, а сама сістэма ўяўляе сабой складана пабудаванае цэлае. Старажытныя грэкі выказвалі думку, што частка заўсёды прасцей цэлага, і толькі вывучыўшы асобна кожную з іх, можна зразумець якасці цэлага. Аднак цэласны і сістэмны падыход да аналізу пэўнай з'явы ці аб'екта, які практыкуецца ў навуцы апошняга стагоддзя, паказаў, што цэлае валодае якасцямі, якіх не мае ніводная з яго частак. Цэлае адлюстроўвае якасці частак, аднак і часткі адлюстроўваюць якасці цэлага. Нельга сцвярджаць, што цэлае больш складанае за часткі, яно проста іншае. З другога боку, паняцце сінергетычнай складанасці ў адносінах да паэтычнага твора разумеецца, галоўным чынам, як *бясконцае сэнсапараджэнне*. Адкуль з'яўляецца такая множнасць тэксту?! На нашу думку, адной з асноўных крыніц сэнсапараджэння ў паэтычным творы выступае яго фонасемантычны ўзровень, пры паўнавартасным функцыянаванні кампанентаў якога ўзнікае імпліцытны паэтычны сэнс. Інфармацыя, што канцэнтруецца ў паэтычным тэксце, значна перавышае якую-небудзь іншую: нагрузка на кожнае слова, яго змястоўны і фармальны бок узрастае, і эфект, які здзяйсняецца паэтычным тэкстам на нашу свядомасць і падсвядомасць, аказваецца больш вялікім, чым простае ўспрыманне сэнсавай ідэі тэксту. Гэта і ёсць сінергетычная мадэль паэтычнага тэксту, заснаваная на комплексным яго ўспрыманні, што ўключае экстралінгвістычную інфармацыю, якую нясе энергія гукаў і гукаспалучэнняў.

На паводзіны складаных нелінейных сістэм робяць уплыў так званыя *флуктуацыі*, альбо знешнія ўздзеянні на сістэму (другое цэнтральнае паняцце). Заснавальнік тэорыі сінергетыкі Г. Хакен лічыў гэты фактар адным з асноватворных, падкрэсліваючы, што «пад спецыфічным уздзеяннем разумеецца такое, якое навязвае сістэме якую-небудзь прасторавую, часавую альбо функцыянальную структуру» [9, с. 29]. Пагаджаючыся з Муратавай, мы лічым асноўнымі флуктацыямі, што ўплываюць на паэтычную сістэму твора, наступныя: 1) свядомасць аўтара, «паколькі ад таленту і лінгвістычнай інтуіцыі паэта залежыць моўная арганізацыя тэксту, у выніку якой адбываецца (ці не адбываецца) самаарганізацыя глыбінных сэнсаў верша» [7, с. 12]; 2) свядомасць чытача, якая ўспрымае тэкст і пераводзіць яго ў рэчышча сваёй уласнай інтэрпрэтацыі, здзяйсняе яго дэкадзіраванне; 3) нацыянальны характар і менталітэт; 4) «вялікі час» (тэрмін М. Бахціна): «...кожны твор мастацтва вядзе дыялог і з галасамі з мінулага, і ўзбагачваецца новымі сэнсамі ў будучым сваім існаванні» [7, с. 12].

Рэгулююць палажэнне ўстойлівасці ці няўстойлівасці любой з такіх сістэм *параметры парадку* (order parameters) (Г. Хакен) – гэта трэцяе цэнтральнае паняцце сінергетыкі. У паэтычнай сістэме мастацкага твора такія параметры парадку вылучаюцца як у структуры, так і ў змесце літаратурна-мастацкай формы. Таму, лічым, правамерна іх абазначыць умоўна як параметры структуры і параметры зместу. Так, звярнуўшыся да гісторыі відаў і жанраў, мы выяўляем, што, напрыклад, у зместавай сістэме санета адбыліся пэўныя змены. Напачатку ён быў прыналежнасцю выключна інтымнай лірыкі, але з часам якія-небудзь абмежаванні для гэтай формы верша перасталі існаваць. Альбо, напрыклад, элегія, у якой напачатку выяўляліся толькі смутак, журба, пазней набыла грамадзянскае, сатырычнае гучанне. У дадзеных выпадках можна гаварыць аб тым, што сістэма адаптавалася да змен і якасна не змянілася. Калі звернемся да тэорыі вершаскладання, то заўважым, што тут адбываецца пастаяннае «ваганне эстэтычнай нормы паміж «цвёрдай», строгай, часам нават жорстка рэгламентаванай формай ці формамі і сродкамі выражэння, як, напрыклад, у паэтыцы класіцызму, і так званымі «свабоднымі» формамі, што з'явіліся ў творчасці першых парушальнікаў канонаў шырока распаўсюджанай у літаратурах розных краін свету –

У. Уітмена, Апалінэра, П. Нэруды і інш.» [3, с. 21]. У мове, напрыклад, «змена параметраў парадку – гэта змена стандартных, нарматыўных моўных формаў; стандартнасць «ператвараецца» ў нестандартнасць, узуальнасць – у неўзуальнасць, нарматыўнасць – у ненарматыўнасць» [7, с. 13].

Паняцце *крытычнай кропкі* ці *раёна біфуркацыі*, у межах якога палажэнне сістэмы становіцца асабліва няўстойлівым, таксама знаходзіць сваё непасрэднае ўвасабленне ў сістэме паэтычнага твора. Зонай біфуркацыі можа выступаць лексема ці пара лексем, фанетычна нагружаных (кумулюць у сабе «фанетычны» сэнс твора), якія па меры разгортвання ўсяго твора «рассейваюць сваю энергію», што праяўляецца ў паўторы асобных гукаў ці гукаспалучэнняў. Такія камбінацыі гукаў уяўляюць сабой своеасаблівыя кластары, асноўная функцыя якіх – стварэнне шматаспектнага гукавобраза (слыхавога, зрокавага, тактыльнага), што, у сваю чаргу, магчыма дзякуючы сінестэзіі. Па-мастацку арганізаваныя гукі сінтэзуюць усё новыя сэнсы, што ўзнікаюць у нашай свядомасці як пэўныя асацыятыўныя вобразы. Звернемся да верша Я. Купалы «Шоў я пушчаю»:

*«Шоў я пушчаю аднойчы, // А ісці нялёгка пушчай, – // Тут насустрач позірк воўчы // Вызірае жудка з гушчы. // Пацярэб'ем, ломам трушчу, // А ён следам патарочай, // Кіну торбай, грыбам-хрушчам, – // Зубы скаліць, пхнецца моўча. // Хоць бы ўжо расстацца з ночай, // Хоць бы вочы дзень расплюшчыў: // Каб заглянуць сонцу ў вочы, // Каб не знаць цянётаў-блюшчаў...»* [4, с. 131].

Фанетычны ўзровень дадзенага твора даволі актыўны. Дзякуючы насычанасці верша «шумам» – паўтор гукаў [ш, ч, х ], а таксама дрыжачага вібранта [р] – чытач не проста ўяўляе карціну, прадстаўленую ў змесце, ён чуе храбусценне той самай пушчы, якое перадаецца не столькі ўжытымі лексемамі – *пушчаю, гушчы, трушчу, хрушчам, расплюшчыў, блюшчаў, ламочча, лушча*, колькі гукавым паўторам [шч] у названых лексемах.

Асноўныя паняцці сінергетыкі, такім чынам, маюць не гранічныя, а ўнутраныя кропкі судакранання з сістэмай паэтычнага твора.

Гісторыя развіцця сінергіі і сінергетыкі як тэрміна і навукі, пачаўшыся ў ХХ стагоддзі, усё ж бярэ пачатак у старажытнай Грэцыі: «Сінергія, альбо сінергізм (ад грэч. synergos – «працаваць разам», syn – «разам», ergon – «праца») – такая з'ява, калі дзве і больш індывідуальныя сілы, энергія ... «працуючы разам», ствараюць эфект больш вялікі, чым сума эфектаў, што ствараюцца імі паасобку» [6, с. 13 ]. Адпаведна прынцыпу сінергіі, у выніку ўзаемадзеяння ўсіх узроўняў паэтычнай сістэмы твора (змястоўнага, інтанацыйнага, рытмічнага, сінтаксічнага, гукавога і інш.) нараджаецца абагульнены паэтычны сэнс, эмоцыя, уражанне, не роўныя «суме сэнсаў», што выражаюцца кожным з такіх узроўняў. Шмат у чым гэта магчыма дзякуючы гукавому, фонасемантычнаму складніку. Мова паэтычныга твора ўпарадкавана па пэўных прынцыпах: маючы на мэце мастацкую выразнасць, у процівагу практычай мове, яна вядзе сябе як дысіпатыўная сістэма: «рассейванне сэнсу адбываецца накшталт рассейвання энергіі» [5, с. 76]. Вядома, што гукавыя спалучэнні, асобныя гукі ці гукакомплексы ў творах паэзіі ўяўляюць сабой не проста набор фанем са сваімі якасцямі, а выступаюць функцыянальнымі элементамі паэтычнага твора, узаемадзеянне якіх стварае фонасемантычны кантэкст, гукавобраз, асацыятыўнае поле, «надрадковы» сэнс (найперш гэта тычыцца гукаперайманняў). Шматфункцыянальная прырода гука (эўфанічная, сімвалічная, эмфатычная (лагічнае вылучэнне слова ў тэксце), філасофска-эксплікацыйная (вытлумачальная) функцыянуе ў паэтычным тэксце па законах сінергетыкі. Безумоўна, пад уздзеяннем моўных і псіхалагічных законаў ва ўспрыманні чытача паэтычны твор паўстае як прадмет слоўнага мастацтва, гукасэнсавая ўпарадкаванасць якога з'яўляецца аўтаматычным стылістычным прыёмам. Акрамя таго, эксплікацыя вобразна-гукавых сродкаў – гэта пераважна аперацыянальны прыём, якім даволі рэдка карыстаецца звычайны чытач. Аднак пры належнай інтэрпрэтацыі паэтычных фігур (у шырокім значэнні), а таксама «фонасемантычных фігур», мы можам разглядаць з'яўленне сэнсу, «як узнікненне новай якасці сістэмы, альбо, інакш кажучы, як саманараджэнне сэнсу» [9, с. 43]. Ідэя залежнасці макраструктуры (макрасэнсу) тэксту ад працэсаў, што маюць месца на ўзроўні складаючых яго элементаў (мікраўзроўні) сугучна сінергетычнай парадыгме. Гукавы ўзровень паэтычнага твора выступае яго мікраўзроўнем, ад арганізацыі якога цалкам залежаць якасці ўсёй сістэмы. Фанетычныя адзінкі паэтычнага тэксту могуць не толькі значна дапаўняць сэнсы, што выражаюцца адзінкамі моўнай прасторы паэтычнага тэксту, аднак і генерыраваць новыя. Калі мы звернемся да твора «Горад» А. Разанава, то ўбачым, як дзякуючы

гукавому паўтору анаграматычнага характару напрыканцы твора ствараецца вобраз Рагнеды, імя якой згадана аўтарам толькі адзін раз. Лексема Рагнеда з'яўляецца ў творы кропкай біфуркацыі, «гукавая энергія» якой рассейваецца па ўсім творы пры дапамозе гукаў р / г / д / + (н). Пералічаныя гукі выступілі ў ролі анаграмных для лексемы Рагнеда. Імя князёўны Рагнеда ўваходзіць у адзін лексіка-семантычны рад з лексемамі *горад / горды / высакародны / сярэдзіна / сарцавіна / «горнае»/ градучае / народзіны / узнагарода / загартаваны ў горне розных прыгод і нягод / ордэну / ардзе / дарогу / ворагі / пагардай / горнуцца / агароды / радзіму / грамаду / гуртуе ў народ / народ / радзіма / адраджаецца / горадзе / Рагвалод / радуецца / Рагнедзе.* Па сутнасці вобраз Рагнеды аказваецца рассыпаным па ўсім творы. Агульная танальнасць вершаказа – пастаяннае паўтарэнне гукаў [г / р / д], якія акустычна з'яўляюцца звонкімі, цвёрдымі, а ў артыкуляцыйным плане гукі «спецыфічныя» – [г] – фрыкатыўны, а – [р] – дрыжачы вібрант пераводзяць змест твора з узроўню лексічнага на фанічны, які, выражаючы дадатковыя сэнсы, спрыяе ўзмацненню праяўлення нескаронасці духу Рагнеды, яе моцы і магчымасці супрацьстаяць лёсу. Увогуле сам горад атаясамліваецца з вобразам Рагнеды. Яна такая ж гордая і высакародная, гэта яе лёс «*загартаваны ў горне розных нягод і прыгод*». І нават калі ёй здрадзіў муж, калі, здавалася б, урэшце «*ўсё знішчаецца дашчэнту, згарае... народ і радзіма*», за якімі прачытваецца вобраз Рагнеды, ён (горад) / яна (Рагнеда) «адраджаецца зноў».

Паэтычны твор – гэта адзінае цэлае і ў той жа час множнасць узаемазвязаных і ўзаемазалежных узроўняў-сістэм. Кожная сістэма, у нашым выпадку фонасемантычная, змяшчае глыбінныя сэнсы, «што непасрэдна не назіраюцца і ўяўляюць сабой сукупнасць унутрытэкставых нелінейных адносін і працэсаў» [7, с. 12]. Фонасемантычныя элементы маюць унікальныя якасці: фанемы пры ўзаемадзеянні ствараюць штосьці большае, чым проста гукаспалучэнні; яны выступаюць энергетычным патэнцыялам, пры нагнятанні якога ўтвараюцца фонасемантычныя рады, якія прыводзяць усю сістэму паэтычнага твора да працэсу сэнсапараджэння.

## Літаратура


1. *Барт, Р.* Избранные работы. Семиотика. Поэтика / Р. Барт. – М.: Прогресс, 1989. – 616 с.
2. Большой энциклопедический словарь. – 2-изд., перераб. и доп. – М.: АСТ: Астрель, 2008. – 1247 с.
3. *Кабаковіч, А. К.* Беларускі свабодны верш / А. К. Кабаковіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – 175 с.
4. *Купала, Я.* Адвечная песня. Вершы і паэмы / Я. Купала. – Мінск: Маст.літ., 2001. – 351 с.
5. *Можейко, М. А.* Становление теории нелинейной динамики в современной культуре / М. А. Можейко. – Мінск, 1999. – 297 с.
6. *Молчанова, Г. Г.* Синергия как основной типообразующий параметр современного языка и межкультурных инноваций / Г. Молчанова // Вестн. Моск. ун-та. Сер. 19: Лингвистика и межкультурная коммуникация. – 2006. – № 4. – С. 9–21.
7. *Муратова, Е. Ю.* Лингвосинергетика поэтического текста / Е. Ю. Муратова. – М.: Инфра-М, 2012. – 218 с.
8. *Пиотровский, Р. Г.* Синергетика текста: учеб. пособие / Р. Г. Пиотровский. – Мінск: МГЛУ, 2005. – 156 с.
9. *Хакен, Г.* Информация и самоорганизация. Макроскопический подход к сложным системам / Г. Хакен. – Л.: КомКнига, 2005. – 248 с.



*T. A. ALYASHKEVICH*


**SYNERGETIC OF THE POETIC WORK**

## Summary


In the article the author intents to demonstrate as knowledge from the field of synergy transforms into the poetic work. The author defines such main ideas of synergy as complex nonlinear system, fluctuation, order parameters, bifurcation point. Degree of their manifestation in the poetic work has been estimated, too.

In result the author comes to conclusion that owing to the phono-semantic component, poetry acquires status of the complex synergetic system.